# САМЫЯ ТАЛЕНАВІТЫЯ

На пачатку лістапада ў інтэрнаце № 3 прайшоў конкурс «Калейдаскоп талентаў», у якім свае творчыя здольнасці прадэманстравалі студэнты розных факультэтаў. Хлопцы і дзяўчаты падрыхтавалі яркія нумары, дзякуючы чаму мерапрыемства атрымалася непаўторным. Так, студэнтка 2 курса БФ Таццяна Яцко выразна прачытала верш Беліндэ «Тебя не хватает», а студэнт 1 курса гэтага ж факультэта Дзмітрый Новікаў прадэкламаваў кулінарнае адступленне з паэмы Ніла Гілевіча «Родныя дзеці». Кранальную песню «Оттепель» з аднайменнага тэлесерыяла выканала студэнтка 2 курса МГФ Ганна Качаненка. Гучнымі апладысментамі падтрымлівалі гледачы таленавітую танцорку – студэнтку 1 курса БФ Вольгу Нікіціну. Уразіла ўсіх таксама выступленне студэнта 1 курса МГФ Паўла Даўганава, які іграў на гітары і спяваў песню «Маяк» гурта «Сплін». Добрай задумай стала правядзенне гульні «Імправізацыя» па аналогіі з аднайменнай праграмай на ТНТ. У ёй мог паўдзельнічаць кожны ахвотны. Загадваўся, напрыклад, пэўны музычны інструмент, а ўдзельнік гульні павінен быў яго паказаць з дапамогай іншага чалавека.

Пераможцаў конкурсу вызначалі члены журы: Таццяна Радзюш, Дзмітрый Аўрамаў, Мікіта Чэкаленка. У выніку першае месца заняў студэнт 1 курса БФ Віталь Лабацэвіч, які прачытаў верш Яўгена Еўтушэнкі «Цветы лучше пуль», другое – Павел Даўганаў, трэцяе – студэнт 1 курса БФ Кірыл Макавецкі, які па-майстэрску сыграў на гітары.

Сваімі ўражаннямі ад мерапрыемства падзялілася выхавальніца інтэрната № 3 Іна Аляксандраўна Суравец: «"Калейдаскоп талентаў" праходзіць у нашым інтэрнаце ў чацвёрты раз. Нам асабліва дарагі гэты конкурс тым, што хлопцы і дзяўчаты тут раскрываюць усе свае таленты: няхай гэта будзе песня, выразнае чытанне паэтычнага ці празаічнага твора, танцы, фокусы, ігра на музычных інструментах. Ніколі не ведаеш, чым здзівяць студэнты ў чарговы раз, якія сюрпрызы падрыхтуюць. Вынікі конкурсу таксама непрадказальныя. Моладзь заўсёды старанна рыхтуе нумары, рэпеціруе, раіцца ў выбары рэпертуару. Асаблівую падзяку за падрыхтоўку і правядзенне конкурсу хочацца выказаць старшыні культурна-масавага сектара Аліне Зуевай, а таксама яе памочніку Уладзіславу Пілiпёнку. Дзякуй усім удзельнікам і арганізатарам "Калейдаскопа талентаў"!»

**Алеся МЯДЗІЛЬ, Ганна МЕЛЬНІКАВА,**